Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы прарэктар БДУКМ
___________ Н. У. Карчэўская
«___» ______________2018 г.
Рэгістрацыйны № ВД- ____ /вуч.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# БІБЛІЯТЭКАЗНАЎСТВА І БІБЛІЯГРАФАЗНАЎСТВА

*Праграма дзяржаўнага экзамену па спецыяльнасці*
*1-23 01 11 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць*
*(па напрамках)*

2018

**СКЛАДАЛЬНІКІ:**

*В. М. Бігеза,* дацэнт кафедры бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат філалагічных навук, дацэнт;

*Ю. М. Галкоўская*, загадчык кафедры бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат педагагічных навук, дацэнт;

*С. В. Зыгмантовіч*, прафесар кафедры бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат педагагічных навук, дацэнт;

*А. Ю. Казленка*, дацэнт кафедры бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат педагагічных навук, дацэнт;

*В. А. Касап*, прафесар кафедры інфармацыйных рэсурсаў і камунікацый установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат педагагічных навук, дацэнт;

*Н. У. Клімянкова,* прафесар кафедры бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат педагагічных навук, дацэнт;

*Н. А. Ляйко*, прафесар кафедры інфармацыйных рэсурсаў і камунікацый установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат гістарычных навук, прафесар;

*С. У. Маланухіна*, выкладчык кафедры інфармацыйных рэсурсаў і камунікацый установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»;

*С. А. Паўлава,* прафесар кафедры бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат філалагічных навук, дацэнт;

*Ж. Л. Раманава,* загадчык кафедры інфармацыйных рэсурсаў і камунікацый установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат педагагічных навук;

*Р. А. Ровіна*, прафесар кафедры інфармацыйных рэсурсаў і камунікацый установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат педагагічных навук, дацэнт;

*В. І. Саітава*, прафесар кафедры бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат педагагічных навук, дацэнт;

*А. І. Фядорына*, дацэнт кафедры інфармацыйных рэсурсаў і камунікацый установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»;

*Т. С. Юхнавец*, старшы выкладчык кафедры інфармацыйных рэсурсаў і камунікацый установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*М. А. Яцэвіч*, прафесар кафедры інфармацыйных рэсурсаў і камунікацый установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат педагагічных навук, дацэнт

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

*Л. А. Аўгуль*, загадчык навукова-даследчага аддзела бібліятэказнаўства Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі;
*Н. А. Булацкая,* прафесар кафедры беларускай і замежнай філалогіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат філалагічных навук, дацэнт

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**
кафедрай інфармацыйных рэсурсаў і камунікацый установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 5 ад 26.01.2018 г.);
кафедрай бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 5 ад 26.01.2018 г.);
саветам факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 5 ад 30.01.2018 г.);
прэзідыумам навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 3 ад 22.02.2018 г.)

Адказны за рэдакцыю: В. Б. Кудласевіч
Адказныя за выпуск: Ю. М. Галкоўская, Ж. Л. Раманава, М. А. Яцэвіч, В. І. Саітава

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Дзяржаўны экзамен па вучэбных дысцыплінах «Бібліятэказнаўства» і «Бібліяграфазнаўства» з’яўляецца формай выніковай атэстацыі студэнтаў і праводзіцца ў адпаведнасці з адукацыйным стандартам ОСВО 1-23 01 11-2014 Вышэйшая адукацыя. Першая ступень. Спецыяльнасць 1-23 01 11 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (па напрамках).

Мэтай дзяржаўнага экзамену з’яўляецца праверка ўзроўню і якасці ведаў выпускніка згодна з патрабаваннямі адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі. Да дзяржаўнага экзамену выпускнік павінен авалодаць акадэмічнымі, сацыяльна-асобаснымі, прафесійнымі кампетэнцыямі для вырашэння задач у сферы прафесійнай і сацыяльнай дзейнасці, авалодаць прафесійнай кампетэнтнасцю для работы ў галіне бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці.

Дзяржаўны экзамен па вучэбных дысцыплінах «Бібліятэказнаўства» і «Бібліяграфазнаўства» з’яўляецца інтэграваным і ўключае пытанні вучэбных дысцыплін цыкла агульнанавуковых і агульнапрафесійных дысцыплін «Бібліятэказнаўства» і «Бібліяграфазнаўства» і вучэбных дысцыплін цыкла спецыяльных дысцыплін. Праграма дзяржаўнага экзамену складаецца з двух раздзелаў: «Бібліятэказнаўства» і «Бібліяграфазнаўства». Такая структура праграмы дзяржаўнага экзамену дазваляе лагічна і сістэмна размеркаваць вучэбны матэрыял.

У адпаведнасці з адукацыйным стандартам на дзяржаўным экзамене выпускнік спецыяльнасці 1-23 01 11 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (па напрамках) павінен *ведаць:*

– асноўныя агульнатэарэтычныя пытанні бібліятэказнаўства: яго функцыі, задачы, заканамернасці развіцця, аб’ект і прадмет, структуру, статус;

– метадалогію і методыку бібліятэказнаўства;

– асаблівасці бібліятэкі як сацыяльнага інстытута; прычыны, гісторыю яе ўзнікнення і аснову функцыянавання;

– прынцыпы, функцыі і тыпалогію бібліятэк, асаблівасці дзейнасці бібліятэк розных тыпаў і відаў;

– шматконтурную сутнасную сістэмную мадэль бібліятэкі;

– структуру і асаблівасці функцыянавання бібліятэчных сетак і сістэм;

– сутнасна-функцыянальную структуру бібліятэчнай справы;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– сацыяльныя функцыі, структуру і ўласцівасці бібліятэчнага фонду; тэхналогію фарміравання бібліятэчнага фонду;

– тэарэтыка-метадычныя асновы бібліятэчна-інфармацыйнага абслугоўвання карыстальнікаў;

– тэарэтыка-метадычныя і арганізацыйныя аспекты бібліятэчна-інфармацыйнага маркетынгу і менеджменту;

– стан і праблемы аўтаматызацыі бібліятэк; сутнасць АБІС і прынцыпы іх пабудовы, сродкі забеспячэння іх функцыянавання;

– тэарэтычныя ўяўленні аб бібліяграфіі, асноўныя паняцці бібліяграфазнаўства;

– кампанентную структуру бібліяграфічнай практычнай дзейнасці;

– відавую структуру бібліяграфіі і бібліяграфічнай прадукцыі;

– узнікненне і тэндэнцыі развіцця сусветнай і беларускай бібліяграфіі;

– віды і галіновы склад, тэхналогію фарміравання і выкарыстання інфармацыйных рэсурсаў;

– нарматыўна-метадычныя матэрыялы па фарміраванні бібліяграфічнага запісу і індэксаванні дакументаў;

– тэрмінасістэму, стан і праблемы аўтаматызацыі бібліятэк, сродкі забеспячэння і сеткавыя тэхналогіі АБІС;

*умець:*

– выкарыстоўваць бібліятэказнаўчыя тэрміны і азначэнні ў ходзе камунікацыі ў працэсе прафесійнай дзейнасці, тэарэтычныя і гісторыка-бібліяграфічныя веды ў прафесійнай практычнай і навуковай дзейнасці;

– дакладна фармуляваць задачы, заканамернасці, аб’ект і прадмет бібліятэказнаўства, структуру, усталёўваць узаемасувязі бібліятэказнаўства з іншымі навуковымі дысцыплінамі;

– вызначаць тыпы і віды бібліятэк, прымяняць атрыманыя веды пры ацэнцы сутнасных і вытворных функцый бібліятэк розных тыпаў і відаў, іх інфармацыйных рэсурсаў і кірункаў дзейнасці;

– аналізаваць і сістэматызаваць бібліяграфічную прадукцыю па формах, тыпах, жанрах, відах;

– абслугоўваць карыстальнікаў інфармацыі з выкарыстаннем сучасных інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– распрацоўваць маркетынгавую стратэгію і ажыццяўляць маркетынгавую ацэнку дзейнасці бібліятэкі;
– ажыццяўляць тэхналагічныя працэсы фарміравання бібліятэчнага фонду ў традыцыйным і аўтаматызаваным рэжымах;
– працаваць у асяроддзі дзеючых АБІС і сетак;
– складаць бібліяграфічнае апісанне на розныя віды дакументаў, у тым ліку ў камунікатыўным BELMARC-фармаце;

*валодаць:*

– асноўнымі паняццямі і тэрмінамі сучаснага бібліятэказнаўства і бібліяграфазнаўства;
– падыходамі да фарміравання і выкарыстання бібліятэчных рэсурсаў, задавальнення інфармацыйных патрэбнасцей карыстальнікаў у працэсе бібліятэчна-інфармацыйнага абслугоўвання, кіравання бібліятэкай як сістэмай, выкарыстання маркетынгавага інструментарыя ў працэсе прафесійнай дзейнасці;
– крытэрыямі распрацоўкі АРМаў, спосабамі прымянення ведаў аб тэхналагічных магчымасцях найбольш распаўсюджаных АРМаў у бібліятэчна-інфармацыйных установах;
– методыкай складання бібліяграфічных запісаў на розныя віды дакументаў;
– методыкай індэксавання дакументаў з выкарыстаннем ББК і УДК;
– традыцыйнымі і інавацыйнымі метадамі абслугоўвання карыстальнікаў інфармацыі з выкарыстаннем галіновых інфармацыйных рэсурсаў.

У адпаведнасці з адукацыйным стандартам вышэйшай адукацыі першай ступені па спецыяльнасці 1-23 01 11 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (па напрамках) выпускнік павінен прадэманстраваць засваенне наступных кампетэнцый.

Акадэмічныя кампетэнцыі:

АК-1. Умець выкарыстоўваць базавыя навукова-тэарэтычныя веды для вырашэння тэарэтычных і практычных задач;

АК-2. Валодаць сістэмным і параўнальным аналізам;

АК-3. Валодаць даследчымі навыкамі;

АК-4. Умець працаваць самастойна;

АК-5. Быць здольным параджаць новыя ідэі (валодаць крэатыўнасцю);

АК-6. Валодаць міждысцыплінарным падыходам да вырашэння праблем;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

АК-7. Мець навыкі, звязаныя з выкарыстаннем тэхнічных устройстваў, кіраваннем інфармацыяй і работай з камп'ютарам.

Прафесійныя кампетэнцыі:

ПК-13. Аказваць кансалтынгавую дапамогу па разнастайных кірунках бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці;

ПК-14. Распрацоўваць метадычныя матэрыялы і рэкамендацыі, арганізацыйна-тэхналагічную дакументацыю;

ПК-18. Выконваць патрабаванні заканадаўчых і нарматыўна-прававых дакументаў у галіне бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці;

ПК-19. Выкарыстоўваць маркетынгавы падыход да кіравання бібліятэчна-інфармацыйнымі ўстановамі;

ПК-21. Ажыццяўляць планаванне, улік і справаздачнасць бібліятэчна-інфармацыйнай работы;

ПК-22. Арганізоўваць работу малых калектываў у працэсе праектнай дзейнасці.

Спецыяліст напрамку спецыяльнасці 1-23 01 11-01 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (менеджмент), акрамя таго, павінен прадэманстраваць засваенне:

ПК-23. Укараняць прынцыпы інавацыйнага менеджменту і сістэмы менеджменту якасці ў работу бібліятэкі;

ПК-24. Выкарыстоўваць інструментарый тэхналагічнага бібліятэчнага менеджменту.

Спецыяліст напрамку спецыяльнасці 1-23 01 11-02 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (аўтаматызацыя), акрамя таго, павінен прадэманстраваць засваенне:

ПК-27. Суправаджаць інфармацыйна-лінгвістычнае і праграмна-тэхнічнае забеспячэнне АБІС;

ПК-28. Валодаць асновамі праектавання і стварэння баз даных, электронных бібліятэк, web-сайтаў;

ПК-29. Адміністраваць бібліятэчныя камп'ютарныя сеткі;

ПК-30. Ажыццяўляць методыку выбару АБІС на інфармацыйным рынку.

Спецыяліст напрамку спецыяльнасці 1-23 01 11-04 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (метадычнае забеспячэнне), акрамя таго, павінен прадэманстраваць засваенне:

ПК-35. Праводзіць метадычны маніторынг і метадычныя даследаванні ў бібліятэках розных тыпаў і відаў;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ПК-36. Выкарыстоўваць методыку фарміравання прафесійных кампетэнцый бібліёграфаў-метадыстаў;

ПК-37. Арганізоўваць і суправаджаць павышэнне кваліфікацыі супрацоўнікаў бібліятэк.

На падрыхтоўку да адказу на дзяржаўным экзамене студэнту адводзіцца не менш за 30 хвілін, на здачу дзяржаўнага экзамену адводзіцца да 30 хвілін. Адказ на дзяржаўным экзамене ажыццяўляецца ў вуснай форме. Падчас дзяржаўнага экзамену і адказу на пытанні білета студэнт можа атрымаць дадатковыя, у тым ліку ўдакладняючыя, пытанні колькасцю не больш трох.

У спіс літаратуры для падрыхтоўкі да дзяржаўнага экзамену ўключаны падручнікі, вучэбныя дапаможнікі, а таксама асноўныя артыкулы вядучых спецыялістаў бібліятэчна-інфармацыйнай сферы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ДЗЯРЖАЎНАГА ЭКЗАМЕНУ

## Раздзел I. Бібліятэказнаўства

### *Тэма 1. Агульнатэарэтычныя асновы бібліятэказнаўства*

Дэфініцыя паняцця «бібліятэказнаўства». Аб'ект і прадмет бібліятэказнаўства. Структура бібліятэказнаўства. Асноўныя канцэпцыі навуковага пазнання ў бібліятэказнаўстве: фармальна-тэхнічная, дакументалісцкая, інфармацыйная.

Метадалогія бібліятэказнаўства як сістэма асноўных прынцыпаў і спосабаў пазнання, арганізацыі і пабудовы тэарэтычнай дзейнасці. Філасофія і логіка як метадалагічная аснова бібліятэказнаўства.

Сістэма метадаў бібліятэказнаўчых даследаванняў. Агульналагічныя метады: аналіз, сінтэз, абстрагаванне, мадэляванне і інш. Агульнанавуковыя і прыватнанавуковыя метады: назіранне, эксперымент, метад аперацыяналізацыі паняццяў, кантэнт-аналіз, апытанне, метад экспертных ацэнак і інш. Спецыяльныя метады бібліятэказнаўчых даследаванняў: метады вывучэння бібліятэчнага фонду і карыстальнікаў бібліятэк.

### *Тэма 2. Бібліятэка як сацыяльны інстытут*

Прычыны ўзнікнення і аснова функцыянавання бібліятэкі. Бібліятэка як сацыяльны інстытут, накіраваны на збор, захоўванне, распаўсюджванне дакументаў і задавальненне інфармацыйных патрэбнасцей карыстальнікаў. Адметныя прыметы і функцыі бібліятэкі як сацыяльнага інстытута. Бібліятэка як інтэгратыўны сацыяльны інстытут.

Прынцыпы дзейнасці бібліятэк, замацаваныя ў заканадаўстве Рэспублікі Беларусь. Вызначэнне прынцыпаў дзейнасці бібліятэк у адпаведнасці з тэорыяй каштоўнасцей: прынцып адпаведнасці агульначалавечым каштоўнасцям; прынцып адпаведнасці нацыянальным каштоўнасцям; прынцып адпаведнасці каштоўнасцям сацыяльных груп; прынцып адпаведнасці каштоўнасцям індывіда.

Функцыі бібліятэк. Сістэмны падыход да іх вызначэння. Сацыяльныя (знешнія) функцыі і тэхналагічныя (унутраныя) функцыі бібліятэк. Сутнасныя сацыяльныя функцыі бібліятэкі (кумулятыўная, мемарыяльная, камунікатыўная): іх азначэнне, асноўныя ўласцівасці. Вытворныя сацыяльныя функцыі: азна-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

чэнне, асноўныя ўласцівасці. Віды вытворных функцый: забеспячэння адукацыі і выхавання, навукі і вытворчасці, культуры, ідэалагічная, сацыялізуючая і інш.

### *Тэма 3. Тыпалагізацыя бібліятэк і арганізацыя бібліятэчнай справы*

Азначэнне паняццяў «тыпалагізацыя», «тып», «від». Значэнне тыпалагізацыі бібліятэк. Тыпалагічныя прыметы бібліятэк. Вызначэнне відаў бібліятэк у заканадаўстве Рэспублікі Беларусь: па форме ўласнасці, па прызначэнні, у залежнасці ад тэрыторыі функцыянавання. Тыпы бібліятэк, якія выдзяляюцца ў адпаведнасці з іх сацыяльным прызначэннем. Публічныя бібліятэкі: тыпалагічныя асаблівасці і віды. Спецыяльныя бібліятэкі: тыпалагічныя асаблівасці і віды.

Бібліятэчная справа як напрамак культурнай дзейнасці па стварэнні і развіцці бібліятэк, фарміраванні і апрацоўцы бібліятэчных фондаў, арганізацыі бібліятэчнага, інфармацыйнага і даведачна-бібліяграфічнага абслугоўвання карыстальнікаў бібліятэк, навукова-метадычным забеспячэнні дзейнасці бібліятэк. Асноўныя прынцыпы арганізацыі бібліятэчнай справы, замацаваныя ў заканадаўстве Рэспублікі Беларусь: рацыянальнае і аптымальнае размяшчэнне сеткі бібліятэк у адпаведнасці з дэмаграфічным складам насельніцтва і з улікам развіцця асобных рэгіёнаў і галін вытворчасці; узаемадзеянне бібліятэк і ўзаемавыкарыстанне іх інфармацыйных рэсурсаў; дзяржаўна-грамадскі характар кіравання бібліятэчнай справай.

### *Тэма 4. Бібліятэчныя сістэмы і сеткі. Сетка публічных бібліятэк Рэспублікі Беларусь*

Азначэнне паняццяў «сістэма бібліятэк» і «сетка бібліятэк». Агульная характарыстыка сукупнай сеткі бібліятэк Рэспублікі Беларусь. Умовы арганізацыі сеткі і размяшчэння бібліятэк краіны, асаблівасці і структура сукупнай сеткі бібліятэк.

Сетка публічных бібліятэк Рэспублікі Беларусь: задачы, структура. Нацыянальная бібліятэка Беларусі: яе тыпалагічныя асаблівасці і функцыі як галоўнай бібліятэкі краіны. Універсальныя навуковыя абласныя бібліятэкі: тыпалагічныя асаблівасці і функцыі як буйных рэгіянальных кнігасховішчаў і цэнтраў бібліятэчнага абслугоўвання насельніцтва. ЦБС публічных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

бібліятэк. Мэты, задачы, структура ЦБС. Функцыі структурных падраздзяленняў ЦБС. Віды ЦБС.

### *Тэма 5. Сеткі спецыяльных бібліятэк Рэспублікі Беларусь*

Асаблівасці стварэння і функцыянавання сетак спецыяльных бібліятэк у Рэспубліцы Беларусь.

Сетка навуковых акадэмічных бібліятэк Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі: задачы, структура. ЦНБ імя Якуба Коласа НАН Беларусі як цэнтр бібліятэчнага абслугоўвання навукі. Сетка навукова-тэхнічных бібліятэк Рэспублікі Беларусь: задачы, структура. Дзейнасць РНТБ. Сетка медыцынскіх бібліятэк Рэспублікі Беларусь: задачы, структура. Дзейнасць РНМБ. Сетка бібліятэк аграпрамысловага комплексу: задачы, структура. Дзейнасць БелСГБ. Сетка бібліятэк вышэйшых навучальных устаноў: задачы, структура. Дзейнасць ФБ БДУ. Сетка бібліятэк сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў і агульнаадукацыйных школ: задачы, структура. Бібліятэкі заканадаўчых, выканаўчых і судовых органаў улады: задачы.

### *Тэма 6. Бібліятэчны фонд як сістэма. Класіфікацыя і структура бібліятэчнага фонду*

Дакумент як фондаўтвараючы элемент. Віды дакументаў, якія складаюць бібліятэчны фонд. Структураўтваральныя прыметы бібліятэчнага фонду: наяўнасць дакументаў; мноства дакументаў; упарадкаванасць мноства дакументаў і інш. Пашпарт бібліятэчнага фонду як пасведчанне яго статусу.

Сістэмныя ўласцівасці фонду: цэласнасць, адкрытасць, мэтанакіраванасць, інфарматыўнасць, дынамічнасць і інш.

Класіфікацыя бібліятэчных фондаў па іх семантычным змесце. Класы фондаў. Паняцці «ўніверсальны фонд» і «спецыялізаваны фонд». Прыметы спецыялізацыі фондаў: тэма, від, мэтавае і/або чытацкае прызначэнне дакумента і інш. Універсальныя фонды агульнаадукацыйнага характару: асаблівасці складу, паўнаты і функцыянальнага прызначэння. Універсальныя фонды навуковага характару: асаблівасці складу, паўнаты і функцыянальнага прызначэння.

Паняцце «галіновы фонд». Асаблівасці складу галіновых фондаў. Суадносіны паняццяў «галіновы фонд» і «спецыялізаваны фонд».

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Паняцце структуры бібліятэчнага фонду. Фактары, якія абумоўліваюць структуру фонду. Паняцце структуравання фонду. Падставы структуравання фонду: від дакумента, структурнае падраздзяленне бібліятэкі, чытацкае прызначэнне і інш.

Узроўні іерархічнага структуравання. Сыходзячая іерархічная сувязь прымет структуравання бібліятэчнага фонду.

### *Тэма 7. Мадэляванне бібліятэчнага фонду*

Значэнне і сутнасць мадэлявання як першага тэхналагічнага працэсу фарміравання бібліятэчнага фонду. Мэта і канчатковы вынік працэсу мадэлявання. Мадэль фонду: паняцце і адрозненні ад рэальнага фонду бібліятэкі.

Агульны алгарытм працэсу мадэлявання: 1) збор і аналіз зыходнай інфармацыі; 2) складанне праектаў мадэляў; 3) абмеркаванне мадэляў; 4) зацвярджэнне мадэляў; 5) бягучая актуалізацыя мадэляў.

Рэальныя мадэлі (мадэлі-копіі) фонду і ідэальныя мадэлі (прагнастычныя мадэлі) фонду. Апісальныя мадэлі бібліятэчнага фонду. Віды апісальных мадэляў. Бібліяграфічныя мадэлі бібліятэчнага фонду. Тэматыка-тыпалагічныя (структурныя) мадэлі бібліятэчнага фонду. Колькасныя (матэматычныя) мадэлі бібліятэчнага фонду.

Суадносіны рэальных і ідэальных мадэляў фонду ў сучаснай бібліятэчна-інфармацыйнай практыцы. Комплекс усіх відаў рэальных і ідэальных мадэляў бібліятэчнага фонду – перадумова яго аптымальнага развіцця.

### *Тэма 8. Камплектаванне бібліятэчнага фонду*

Сутнасць і значэнне працэсу камплектавання бібліятэчнага фонду. Мэта камплектавання. Камплектаванне бібліятэчнага фонду як двухнакіраваны працэс.

Віды камплектавання бібліятэчнага фонду. Першаснае і другаснае камплектаванне. Бягучае, рэтраспектыўнае камплектаванне і рэкамплектаванне. Накіраванасць і задача камплектавання зноў ствараемага бібліятэчнага фонду.

Этапы камплектавання бібліятэчнага фонду. Алгарытмы працэсаў папаўнення і выключэння дакументаў з бібліятэчнага фонду.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Аперацыі працэсу камплектавання, якія забяспечваюцца сістэмай аўтаматызацыі бібліятэкі: апрацоўка прайс-лістоў, планаў выдавецтваў; кантроль паступлення дакументаў і інш.

Інфармацыйныя рэсурсы камплектавання бібліятэчнага фонду. Картатэкі/базы даных заказаў. Адрасныя картатэкі/базы даных пастаўшчыкоў дакументаў. Інфармацыйныя рэсурсы Інтэрнэту: сайты выдавецтваў, кнігагандлёвых фірм.

### *Тэма 9. Улік і апрацоўка бібліятэчнага фонду*

Сутнасць і значэнне ўліку бібліятэчнага фонду. Мэты, задачы і функцыі ўліку бібліятэчнага фонду. Аб’екты ўліку. Патрабаванні, якія прад’яўляюцца да вядзення ўліку бібліятэчнага фонду.

Стандарты і інструкцыі па ўліку бібліятэчнага фонду. Стандартызацыя адзінак уліку фонду.

Віды ўліку дакументаў у бібліятэчным фондзе. Назначэнне сумарнага (інтэграванага) і індывідуальнага (дыферэнцыраванага) уліку бібліятэчнага фонду. Формы ўліку. Актавая форма ўліку бібліятэчнага фонду як альтэрнатыўная форма індывідуальнага ўліку.

Праверка бібліятэчнага фонду. Мэта і задачы праверкі. Віды праверак у залежнасці ад аб’ёму фонду. Этапы праверкі. Метады (спосабы) праверкі бібліятэчнага фонду: асноўныя і дапаможныя.

Фондавая апрацоўка дакументаў. Працэс тэхнічнай апрацоўкі дакументаў: мэта, аперацыі і канчатковы вынік. Працэс бібліяграфічнай (навуковай) апрацоўкі дакументаў: мэта, аперацыі і канчатковы вынік.

### *Тэма 10. Сістэма, структура і тэхналогія абслугоўвання карыстальнікаў у бібліятэках рознага тыпу*

Змястоўны аспект тэрміна «сістэма бібліятэчнага абслугоўвання». Элементы сістэмы. Асноўныя патрабаванні да сістэмы абслугоўвання. Арганізацыйна-функцыянальная структура абслугоўвання. Задачы функцыянальных падраздзяленняў (аддзелаў, сектараў) абслугоўвання абанентаў. Нарматыўныя дакументы, якія рэгулююць дзейнасць аддзела абслугоўвання. Чытальныя залы, індывідуальныя рабочыя месцы для карыстальнікаў, даведачна-інфармацыйны аддзел, абанемент, пазастацыянарнае абслугоўванне. Прадастаўленне доступу да асобных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

відаў дакументаў: медыятэкі, фанатэкі, відэатэкі. Міжбібліятэчны абанемент, электронная дастаўка дакументаў. Рэкрэацыйныя службы бібліятэкі. Узаемадзеянне функцыянальных падраздзяленняў абслугоўвання ў электронным асяроддзі. Электронныя чытальныя залы.

Тэхналогія бібліятэчнага абслугоўвання як сукупнасць прыёмаў і метадаў. Тыпы тэхналогій бібліятэчнага абслугоўвання. Асаблівасці тэхналагічных працэсаў абслугоўвання на аўтаматызаваным рабочым месцы. Улікова-тэхнічная дакументацыя абслугоўвання. Улік вынікаў абслугоўвання ў традыцыйнай і электроннай формах.

### *Тэма 11. Індывідуальнае абслугоўванне карыстальнікаў бібліятэк*

Індывідуальнае абслугоўванне – аснова бібліятэчнага абслугоўвання. Распрацоўка праблем індывідуальнага абслугоўвання ў працах расійскіх і беларускіх бібліятэказнаўцаў. Задачы індывідуальнага абслугоўвання.

Псіхолага-педагагічныя аспекты індывідуальнага абслугоўвання. Бібліятэчныя зносіны і іх роля ў індывідуальным абслугоўванні. Тэхналогіі індывідуальнага абслугоўвання. Формы адраснага распаўсюджвання інфармацыі з дапамогай камп’ютарных тэхналогій. Гутарка і кансультацыя як асноўныя формы індывідуальнай работы з чытачамі. Індывідуальнае абслугоўванне ў навуковых і спецыяльных бібліятэках. Вывучэнне і аналіз вынікаў індывідуальнага абслугоўвання.

### *Тэма 12. Масавае і групавое абслугоўванне карыстальнікаў бібліятэк*

Распрацоўка тэарэтыка-метадычных аспектаў масавага абслугоўвання ў працах расійскіх і беларускіх бібліятэказнаўцаў. Вызначэнне тэрмінаў «масавае бібліятэчна-інфармацыйнае абслугоўванне», «групавое і франтальнае абслугоўванне». Сацыяльна-псіхалагічныя асновы масавага абслугоўвання.

Формы нагляднага інфармавання і аўдыявізуальнай рэкламы дакументаў. Кніжныя выставы, іх класіфікацыя. Этапы работы над выставай. Адкрытыя прагляды дакументаў, методыка іх арганізацыі. Электронныя выставы.

Традыцыйныя і інавацыйныя формы вуснага інфармавання карыстальнікаў: іх характарыстыка, методыка падрыхтоўкі і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

правядзення. Стварэнне прэзентацыйных матэрыялаў. Аматарскія аб'яднанні чытачоў пры бібліятэках. Комплексныя формы абслугоўвання. Методыка распрацоўкі, этапы падрыхтоўкі і правядзення мерапрыемстваў у межах праектнай дзейнасці бібліятэк. Арганізацыя чытацкіх зносін як перспектыўны кірунак масавай работы бібліятэк. Бібліятэка – цэнтр чытацкіх зносін.

### *Тэма 13. Формы масавага абслугоўвання з улікам сацыяльна-псіхалагічных і ўзроставых асаблівасцей юных карыстальнікаў*

Чытацкае развіццё асобы дзіцяці. Псіхафізіялагічныя асаблівасці дзяцей-дашкольнікаў, малодшых школьнікаў, падлеткаў, юнакоў у кантэксце іх чытацкага развіцця. Уплыў узроставых асаблівасцей на сацыялізацыю асобы. Улік узроставых асаблівасцей пры бібліятэчным абслугоўванні. Арганізацыя чытацкіх стасункаў у бібліятэцы. Нагляднае інфармаванне дзяцей, падлеткаў, юнакоў у бібліятэцы. Асаблівасці афармлення выстаў для дзяцей дашкольнага і малодшага школьнага ўзросту.

Масавая работа з дзецьмі і падлеткамі. Інавацыйныя формы. Інтэрактыўныя формы масавай работы. Гульні і спаборніцтвы. Значэнне і роля камп'ютарных гульняў. Арганізацыя пры бібліятэках дзіцячых аматарскіх аб'яднанняў. Кірункі і змест работы. Работа бібліятэк з дзецьмі і падлеткамі ў дапамогу навучальнаму працэсу. Гурткі і школы па ўдасканаленні тэхнікі чытання. Гурткі па вывучэнні замежных моў. Сувязь са школьнымі бібліятэкамі.

### *Тэма 14. Маркетынг як сучасная канцэпцыя кіравання бібліятэкай*

Паняцце «маркетынг». Сутнасць і змест маркетынгу. Мэты і задачы маркетынгу. Прынцыпы маркетынгу. Характарыстыка агульных і спецыфічных функцый маркетынгу.

Прырода некамерцыйнага маркетынгу і яго месца ў грамадскіх працэсах. Арганізацыя маркетынгавага кіравання ў некамерцыйнай сферы. Прынцыпы маркетынгу.

Структура і склад маркетынгавых камунікацый. Асноўныя сродкі маркетынгавых камунікацый. Паблік рылейшнз (PR) як асноўны сродак маркетынгавых камунікацый: яго задачы і мэтавыя групы. Сістэма мерапрыемстваў PR (PR-кампаніі).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Бібліятэчная рэклама ў сістэме маркетынгавых камунікацый. Функцыі рэкламы ў сучасных сацыяльна-эканамічных і інфармацыйна-тэхналагічных умовах (сацыяльная, выхаваўчая, ідэалагічная, эканамічная і інш.). Спецыфіка рэкламнай дзейнасці ў бібліятэчнай сферы. Тэхналогія рэкламнай дзейнасці.

Значэнне маркетынгу ў кіраванні бібліятэчнай справай.

### *Тэма 15. Эвалюцыя менеджменту і фарміраванне канцэпцыі бібліятэчнага менеджменту*

Асноўныя этапы эвалюцыі менеджменту, іх характарыстыка. Адлюстраванне эвалюцыі тэорыі і практыкі менеджменту ў розных канцэпцыях і школах. Развіццё школ кіраўнічай думкі: навуковага, адміністрацыйнага кіравання, чалавечых адносін, навукі аб паводзінах, а таксама матэматычных метадаў.

Змест, значэнне працэснага, сістэмнага і сітуацыйнага падыходаў да кіравання бібліятэкай.

Выкарыстанне ў сучасных умовах прынцыповых палажэнняў чатырох кіраўнічых школ у развіцці бібліятэчнага менеджменту.

90-я гг. XX ст. – пачатак фарміравання канцэпцыі бібліятэчнага менеджменту. Метадалагічныя асновы менеджменту бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці.

### *Тэма 16. Стратэгічнае кіраванне бібліятэчнай дзейнасцю*

Канцэпцыя стратэгічнага менеджменту. Перадумовы фарміравання і развіццё стратэгічнага менеджменту. Асноўныя складаючыя стратэгічнага менеджменту. Тыпы кіравання адпаведна храналагічнай класіфікацыі развіцця стратэгічнага менеджменту. Месца і значэнне стратэгічнага менеджменту ў кіраванні сучаснай бібліятэкай.

Распрацоўка стратэгічных кірункаў развіцця бібліятэкі. Этапы стратэгічнага кіравання. Вызначэнне місіі бібліятэкі. Уклад П. Друкера ў абагульненне і сістэматызацыю элементаў місіі. Роля місіі ў жыццядзейнасці бібліятэкі. Падыходы да ўстанаўлення мэт функцыянавання бібліятэкі. Дыягнастычны этап стратэгічнага кіравання. Правядзенне аналізу знешняга і ўнутранага асяроддзя бібліятэкі: метад SWOT. Этап выпрацоўкі стратэгіі бібліятэкі: тыпы стратэгій, вызначэнне стратэгіі, ацэнка стратэгіі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Кампаненты рэалізацыі стратэгіі: тактыка, палітыка, правілы, працэдуры.

Ацэнка і кантроль рэалізацыі стратэгіі – завяршальны этап стратэгічнага кіравання.

### *Тэма 17. Улік і справаздачнасць. Бібліятэчная статыстыка*

Прадмет і задачы бібліятэчнай статыстыкі, яе роля ў кіраванні бібліятэчнай справай. Раздзелы бібліятэчнай статыстыкі: статыстыка бібліятэчнага фонду, статыстыка бібліятэчнага абслугоўвання, статыстыка бібліятэчнай сеткі, статыстыка бібліятэчных кадраў.

Арганізацыя статыстычнай работы ў бібліятэцы. Статыстычнае даследаванне, яго этапы. Першы этап статыстычнага даследавання: статыстычнаеназіранне, яго віды і спосабы. Улік у бібліятэцы: віды, формы, метады. Справаздачнасць як форма статыстычнага назірання, яго асаблівасці.

Другі этап статыстычнага даследавання ў бібліятэцы: зводка і групоўка статыстычных матэрыялаў: праверка, сістэматызацыя, апрацоўка і падлік даных, атрыманых на першым этапе. Статыстычныя табліцы. Графічнае адлюстраванне статыстычных даных.

Аналіз даных – заключны этап статыстычнага даследавання. Яго задачы і асаблівасці.

Паказчыкі бібліятэчнай статыстыкі: абсалютныя, адносныя, сярэднія. Сучасныя праблемы і перспектывы ўдасканалення статыстыкі.

### *Тэма 18. Кіраванне праектамі ў бібліятэчнай сферы*

Асаблівасці праектнай дзейнасці бібліятэк. Кіраванне праектамі як навуковы кірунак у тэорыі кіравання. Характарыстыка фактараў, якія вызначаюць значнасць праектнай дзейнасці бібліятэкі. Вызначэнне паняццяў «праграма», «праект». Рэспубліканскія мэтавыя праграмы і іх роля ў сацыяльна-культурным асяроддзі. Класы праектаў у бібліятэчнай справе. Мегапраекты як мэтавыя праграмы развіцця культуры на абласным і рэгіянальным узроўні. Мультыпраекты як мэтавыя комплексныя праграмы на ўзроўні раёна, горада. Асаблівасці і характарыстыка монапраектаў бібліятэк. Тэхналогія праектавання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мадэль «жыццёвага цыкла праекта»: характарыстыка чатырох яго этапаў (канцэпцыя, распрацоўка ідэі; распрацоўка праекта; рэалізацыя праекта; завяршэнне праекта).

### *Тэма 19. Сутнасць аўтаматызацыі бібліятэк і АБІС*

Паняцце і тэрмінасістэма аўтаматызацыі бібліятэк. Мэты, задачы, змест, маштабнасць аўтаматызацыі бібліятэк. Бібліятэка як аб’ект аўтаматызацыі.

Стан аўтаматызацыі ў бібліятэках Беларусі і іншых краінах свету: параўнальны аналіз.

Бібліятэка як аб’ект аўтаматызацыі. Кампанентная структура бібліятэкі і АБІС.

Вызначэнне АБІС як разнавіднасці АІС. АБІС як вынік аўтаматызацыі бібліятэкі. АБІС як складаны арганізацыйна-тэхналагічны комплекс. Класіфікацыя АБІС.

### *Тэма 20. Арганізацыйна-функцыянальная структура АБІС*

Паняцце арганізацыйна-функцыянальнай структуры і архітэктуры АБІС, іх узаемасувязь.

Функцыянальная структура АБІС. Функцыянальныя падсістэмы. Функцыянальныя задачы.

Аўтаматызаваныя рабочыя месцы (АРМ) як асноўны спосаб рэалізацыі функцыянальных падсістэм і задач аўтаматызацыі працы бібліятэчнага работніка. АРМы і праграмныя модулі, іх суадносіны. Віды праграмных модуляў. Крытэрыі распрацоўкі АРМаў. Класіфікацыя АРМаў па функцыянальным прызначэнні і месцы выкарыстання.

Тэхналагічныя магчымасці найбольш распаўсюджаных АРМаў: «Камплектатар», «Каталагізатар», «Чытач», «Кнігавыдача», «Адміністратар».

### *Тэма 21. Сродкі забеспячэння АБІС: агульная характарыстыка*

Сродкі інфармацыйнага забеспячэння. Віды інфармацыі, якія цыркулююць у сістэме. Фарматы запісу і перадачы даных.

Сродкі лінгвістычнага забеспячэння. Інфармацыйна-пошукавыя мовы, якія выкарыстоўваюцца ў АБІС.

Сродкі праграмнага забеспячэння. Агульнае (стандартнае) і прыкладное праграмнае забеспячэнне АБІС. Мовы праграмавання для АБІС. Сістэмы кіравання базамі даных АБІС.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сродкі тэхнічнага забеспячэння. Камп'ютарныя і перыферыйныя ўстройствы. Сеткавае абсталяванне. Сродкі мультымедыя. Выбар і патрабаванні да тэхнічнага забеспячэння АБІС.

Арганізацыйна-кадравае забеспячэнне.

## Раздзел II. Бібліяграфазнаўства

### *Тэма 22. Бібліяграфія ў інфармацыйнай інфраструктуры грамадства*

Узнікненне ў старажытным грамадстве элементаў бібліяграфіі як неад'емнай часткі тэкстаў (дакументаў), сродку іх ідэнтыфікацыі і пошуку. З'яўленне паняцця «бібліяграфія», яго этымалогія і генезіс. Шматзначнасць сучаснага выкарыстання тэрміна «бібліяграфія».

Паняцце аб метасістэме існавання бібліяграфіі як грамадскай з'явы. Сістэма дакументальных камунікацый як метасістэма існавання бібліяграфіі. Асноўныя элементы і іх характарыстыка. Інфармацыйныя бар'еры паміж дакументаванай інфармацыяй і карыстальнікамі. Роля бібліяграфіі ў іх пераадоленні (дакументаграфічная канцэпцыя).

Свет тэкставых камунікацый як метасістэма існавання бібліяграфіі (кагнітаграфічная канцэпцыя). Асноўныя элементы і іх характарыстыка. Універсум чалавечай дзейнасці як метасістэма існавання бібліяграфіі (ідэаграфічная канцэпцыя). Асноўныя элементы і іх характарыстыка.

Заканамернасці развіцця бібліяграфіі. Знешнія (сацыяльныя) функцыі бібліяграфіі.

### *Тэма 23. Бібліяграфічная інфармацыя і бібліяграфічныя веды ў тэрмінасістэме бібліяграфазнаўства*

Бібліяграфічная інфармацыя як разнавіднасць сацыяльнай інфармацыі і як крытэрый адмежавання бібліяграфічных з'яў ад небібліяграфічных.

З'яўленне паняцця «бібліяграфічная інфармацыя» і развіццё тэарэтычных поглядаў на аб'ём паняцця. Разуменне сутнасці бібліяграфічнай інфармацыі як інфармацыі другаснай, адасобленай ад дакумента згодна дакументаграфічнай канцэпцыі бібліяграфіі. Непарыўная сувязь бібліяграфічнай інфармацыі з

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

тэкстам і адчужанасць ад яго. Прагнозная, латэнтная, афінная постэдыцыйная бібліяграфічная інфармацыя.

Паняцце «бібліяграфічныя веды». Структура бібліяграфічных ведаў. Суадносіны паняццяў «бібліяграфічная інфармацыя» і «бібліяграфічныя веды».

Бібліяграфічная інфармацыя і метаданыя.

Асноўныя ўласцівасці бібліяграфічнай інфармацыі.

### *Тэма 24. Бібліяграфічная дзейнасць як сістэма. Арганізацыя бібліяграфічнай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь*

Бібліяграфічная дзейнасць у сістэме відаў чалавечай дзейнасці. Паняцце «бібліяграфічная дзейнасць» у тэрмінасістэме бібліяграфазнаўства, яго генезіс, уяўленне аб ім у канцэпцыях розных аўтараў (А. П. Коршунава, М. Г. Вохрышавай), стандартах. Суадносіны паняццяў «бібліяграфічная дзейнасць» і «бібліяграфія». Бібліяграфічная практыка і пазнанне як асноўныя часткі бібліяграфічнай дзейнасці. Асноўныя рысы бібліяграфічнай практычнай дзейнасці. Бібліяграфічная практычная дзейнасць як аснова бібліяграфічнай навукова-даследчай дзейнасці, бібліяграфічнай вучэбнай дзейнасці і інш. Іх сувязь і ўзаемаўзбагачэнне. Прынцыпы і заканамернасці бібліяграфічнай дзейнасці.

Арганізацыя бібліяграфічнай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь на сучасным этапе. Асноўныя цэнтры бібліяграфічнай дзейнасці: іх задачы, функцыі, асаблівасці і ўмовы ўзаемадзеяння. Асноўныя рэспубліканскія, ведамасныя праекты бібліятэк па сумесным вядзенні БД, бібліяграфічным абслугоўванні, падпісцы і забеспячэнні доступу да БД і інш.

### *Тэма 25. Бібліяграфічная прадукцыя: сучасныя формы, жанры і віды*

Бібліяграфічны дапаможнік як асноўны спосаб існавання і сродак распаўсюджвання дакументаванай бібліяграфічнай інфармацыі. Паняцці «бібліяграфічны дапаможнік», «бібліяграфічны дакумент», «бібліяграфічны рэсурс», «бібліяграфічны прадукт».

Формы існавання бібліяграфічнай прадукцыі: карткавыя, друкаваныя, рукапісныя, несамастойныя выдавецкія формы, электронныя.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Жанры бібліяграфічнай прадукцыі.

Віды бібліяграфічнай прадукцыі па грамадскім прызначэнні, функцыянальна-мэтавай (храналагічнай) прымеце, змястоўных прыметах бібліяграфіруемых дакументаў, метадах бібліяграфавання.

### *Тэма 26. Сучасныя канцэпцыі бібліяграфазнаўства*

Дасягненні бібліяграфазнаўства, выкліканыя ўдасканаленнем метадалогіі даследаванняў (дыялектычнага метаду, сістэмнага і дзейнаснага падыходаў і інш.), укараненнем аўтаматызаваных інфармацыйных тэхналогій.

Дакументаграфічная канцэпцыя бібліяграфіі А. П. Коршунава. Метадалагічная аснова канцэпцыі. Роля бібліяграфічнай інфармацыі.

Кагнітаграфічная канцэпцыя бібліяграфіі як грамадскай з'явы. Уяўленні В. А. Факеева аб бібліяграфіі як сацыякультурным комплексе, які ўключае бібліяграфічныя веды (інфармацыю), бібліяграфічны сацыяльны інстытут, бібліяграфічную дзейнасць і бібліяграфічную культуру.

Ідэаграфічная канцэпцыя бібліяграфіі Н. А. Слядневай.

Культуралагічная канцэпцыя бібліяграфіі (М. Г. Вохрышава, Н. Б. Зіноўева). Метадалагічная аснова канцэпцыі. Спецыфіка бібліяграфіі ў метасістэме «культура».

### *Тэма 27. Тэарэтычныя асновы складання бібліяграфічнага запісу дакументаў*

Паняцце «бібліяграфічны запіс» і яго структура. Бібліяграфічнае апісанне як элемент бібліяграфічнага запісу, яго прызначэнне і выкарыстанне ў бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці і іншых галінах дакументнай камунікацыі. Роля бібліяграфічнага апісання ў распаўсюджванні навуковых ведаў.

Функцыі бібліяграфічнага запісу і патрабаванні, якія прад'яўляюцца да яго. Суадносіны паняццяў «бібліяграфічнае апісанне» і «бібліяграфічны запіс», «каталагізацыйны запіс». Першы элемент бібліяграфічнага запісу.

Асноўныя прынцыпы складання бібліяграфічнага запісу. Бібліяграфічны запіс пад загалоўкам і назвай дакумента. Віды бібліяграфічнага запісу.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 28. Бібліяграфічны запіс у электроннай форме*

Фарматы электроннай каталагізацыі. Стварэнне, распаўсюджванне, асаблівасці і агульныя тэндэнцыі распрацоўкі фармату MARC і яго варыянтаў. Камунікатыўныя фарматы прадстаўлення бібліяграфічных запісаў у электроннай форме. Міжнародны фармат UNIMARC: агульная характарыстыка і асноўнае прызначэнне.

Структура фармату BELMARC. Асаблівасці фарміравання бібліяграфічных запісаў у электроннай форме ў структуры фармату BELMARC. Асноўныя кампаненты бібліяграфічнага запісу ў электроннай форме: маркер, даведнік, палі даных. Характарыстыка функцыянальных блокаў. Меткі, індыкатары палёў, ідэнтыфікатары падпалёў.

Аўтарытэтныя/нарматыўныя запісы: значэнне, прынцыповае адрозненне ад бібліяграфічных запісаў у электроннай форме. Структура фармату прадстаўлення аўтарытэтных/нарматыўных запісаў (BELMARC/ AUTHORITIES).

### *Тэма 29. Бібліятэчна-бібліяграфічная класіфікацыя (ББК)*

ББК як іерархічная ўніверсальная камбінацыйная сістэма класіфікацыі. Стварэнне ББК і яе прынцыповыя асновы.

Структура ББК: асноўныя табліцы, дапаможныя табліцы (табліцы тыпавых дзяленняў), алфавітна-прадметны паказальнік (АПП). Індэксацыя табліцы. Варыянты табліц ББК: напаўненне і прызначэнне. Актуалізацыя і выкарыстанне табліц ББК у якасці інфармацыйна-пошукавай мовы. Машыначытальная версія ББК (БД ББК). Пошукавыя магчымасці БД ББК. Індэксы табліц ББК у структуры фармату BELMARC.

### *Тэма 30. Універсальная дзесятковая класіфікацыя (УДК)*

УДК як іерархічная ўніверсальная камбінацыйная сістэма класіфікацыі. Прынцыпы і ўласцівасці пабудовы, сутнасць УДК. Структура УДК: асноўныя і дапаможныя табліцы (агульныя і спецыяльныя вызначальнікі), алфавітна-прадметны паказальнік. Індэксацыя і сінтаксічныя знакі. Правілы індэксавання. Дзейнасць Кансорцыума УДК. ГОСТ 7.90-2007 «Универсальная десятичная классификация. Структура, правила ведения и индексирования». Варыянты табліц УДК. Актуалізацыя і выкарыстанне табліц УДК у якасці інфармацыйна-пошукавай мовы ў навуковых і іншых бібліятэках, органах НТІ Беларусі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Машыначытальная версія УДК (БД УДК): структура, віды пошуку.

Індэксы УДК у структуры BELMARC фармату. Тэхналогія запаўнення падпалёў.

### *Тэма 31. Электронны каталог як інфармацыйна-пошукавая сістэма. Зводны электронны каталог*

Паняцце «электронны каталог» (ЭК), яго сутнасць, функцыі, асноўныя прынцыпы пабудовы і патрабаванні. Праблемы арганізацыі і вядзення ЭК. Характарыстыка праграмнага забеспячэння, фарматаў уводу бібліяграфічных звестак. Структура і методыка вядзення электроннага каталога. Лінгвістычнае забеспячэнне ЭК. Віды пошуку. Выкарыстанне ЭК, яго функцыянальныя магчымасці.

Зводны электронны каталог, азначэнне, функцыі, прызначэнне. Зводныя каталогі як сродак каардынацыі і кааперыравання камплектавання і выкарыстання фондаў. Удзел бібліятэк Беларусі ў стварэнні зводнага электроннага каталога. Рэгіянальныя зводныя каталогі бібліятэк Беларусі.

Нацыянальная сістэма карпаратыўнай каталагізацыі. Тэхналогія фарміравання і функцыянавання зводных электронных каталогаў у сістэме карпаратыўнай каталагізацыі.

Замежны вопыт арганізацыі сістэмы карпаратыўнай каталагізацыі.

### *Тэма 32. Арганізацыйна-функцыянальная структура бібліяграфічнай службы розных тыпаў бібліятэк Беларусі*

Уяўленне аб бібліяграфічнай службе бібліятэкі, яе задачы ў сучасных умовах. Залежнасць яе арганізацыйна-функцыянальнай структуры ад задач бібліятэкі, яе тыпу, месца бібліятэкі ў сетцы рэгіёна (галіны), спецыялізацыі дзейнасці і зместу бібліяграфічных працэсаў.

Асаблівасці структуры бібліяграфічнай службы бібліятэк розных тыпаў у Рэспубліцы Беларусь. Паняцце аб цэнтралізаваным і дэцэнтралізаваным характары бібліяграфічнай службы бібліятэкі. Арганізацыйна-функцыянальная структура бібліяграфічнай службы бібліятэк розных тыпаў. Арганізацыя бібліяграфічнай дзейнасці ў бібліятэках, якія не маюць бібліяграфічных падраздзяленняў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Асноўныя функцыі бібліяграфічнага падраздзялення бібліятэкі. Бібліяграфічныя працэсы ў небібліяграфічных падраздзяленнях бібліятэкі.

### *Тэма 33. Даведачна-бібліяграфічны апарат (ДБА) бібліятэкі*

Даведачна-бібліяграфічны апарат бібліятэкі: азначэнне паняцця, функцыянальнае прызначэнне, структура. Уласны ДБА бібліятэкі і «віртуальны» ДБА, даступны ў рэжыме аддаленага доступу. Адзінства прынцыпаў і метадычных рашэнняў у фарміраванні ўсіх частак ДБА.

Сістэма каталогаў і картатэк бібліятэкі: азначэнне, адрозненні, тэндэнцыі развіцця ва ўмовах аўтаматызацыі бібліяграфічнай дзейнасці. Трансфармацыя картатэк у бібліяграфічныя, фактаграфічныя базы даных. Характарыстыка БД, генерыруемых бібліятэкамі краіны.

Даведачна-бібліяграфічны фонд (ДБФ) бібліятэкі: склад, функцыянальнае прызначэнне, прынцыпы і крыніцы камплектавання. Асаблівасці арганізацыі ДБФ у бібліятэках. Афіцыйныя выданні, матэрыялы і БД прававой інфармацыі ў складзе ДБФ. Відавы склад даведачнай літаратуры. Электронныя даведачныя выданні. Даведачныя рэсурсы ў Інтэрнэце. Бібліяграфічныя выданні, неапублікаваныя бібліяграфічныя дапаможнікі, бібліяграфічныя БД у ДБФ бібліятэкі. Бібліяграфічныя рэсурсы ў Інтэрнэце.

Сеткавыя электронныя рэсурсы ў структуры ДБА бібліятэкі. Навігатары (пуцевадзіцелі) як сродкі забеспячэння доступу да інтэрнэт-рэсурсаў у бібліятэцы.

### *Тэма 34. Тэхналогія вытворчасці бібліяграфічнай прадукцыі*

Асноўныя этапы складання бібліяграфічных дапаможнікаў розных відаў, тыпаў, жанраў, форм. Характарыстыка тэхналагічных працэсаў падрыхтоўчага этапу вытворчасці бібліяграфічнай прадукцыі. Аналітычны этап падрыхтоўкі бібліяграфічных дапаможнікаў і яго працэсы.

Мэты і асноўныя працэсы сінтэтычнага этапу складання бібліяграфічных дапаможнікаў. Мэты і асноўныя працэсы заключнага этапу падрыхтоўкі бібліяграфічных дапаможнікаў.

Падрыхтоўка бібліяграфічных дапаможнікаў з выкарыстаннем сродкаў аўтаматызацыі. Тэхналогія фарміравання бібліяграфічных БД: распрацоўка тэхнічнага задання; вызначэнне

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

крыніц выяўлення дакументаў; правядзенне бібліяграфічнага пошуку; адбор дакументаў; падрыхтоўка бібліяграфічных запісаў з выкарыстаннем машыначытальных фарматаў; актуалізацыя БД. Рэгістрацыя генерыруемых БД.

### *Тэма 35. Бібліяграфічнае інфармаванне спажыўцоў інфармацыі ў бібліятэках*

Бібліяграфічнае абслугоўванне: азначэнне, асноўныя віды.

Бібліяграфічнае інфармаванне. Сутнасць масавага бібліяграфічнага інфармавання, яго асноўныя формы, арганізацыя і тэхналогія падрыхтоўкі і правядзення. Трансфармацыя форм масавага бібліяграфічнага інфармавання ва ўмовах аўтаматызаваных тэхналогій абслугоўвання карыстальнікаў.

Сутнасць, тэхналогія і формы дыферэнцыраванага бібліяграфічнага інфармавання. Сістэма выбарчага распаўсюджвання інфармацыі (ВРІ) як найбольш эфектыўная форма індывідуальнага інфармавання. Аўтаматызаваная сістэма ВРІ.

Асноўныя формы групавога бібліяграфічнага інфармавання і іх асаблівасці ва ўмовах выкарыстання аўтаматызаванай тэхналогіі.

### *Тэма 36. Тэхналогія даведачна-бібліяграфічнага абслугоўвання карыстальнікаў інфармацыі*

Даведачна-бібліяграфічнае абслугоўванне: азначэнне, асноўныя элементы. Тэхналогія даведачна-бібліяграфічнага абслугоўвання: прыём запыту; устанаўленне кола крыніц, неабходных для аптымальнага задавальнення запыту; пошук бібліяграфічнай, фактаграфічнай інфармацыі; афармленне даведкі; рэгістрацыя даведкі ў журнале ўліку; выдача ці накіраванне яе абаненту. Асаблівасці аўтаматызаванай тэхналогіі выканання разавых запытаў. Асноўныя тыпы бібліяграфічнага пошуку.

Даведачна-бібліяграфічнае абслугоўванне з выкарыстаннем сродкаў Інтэрнэту: асаблівасці пошуку з улікам магчымасцей пошукавага інтэрфейсу выкарыстоўваемых рэсурсаў і характару запытаў.

Віртуальная служба даведачна-бібліяграфічнага абслугоўвання: тэхналогія выканання запытаў карыстальнікаў у электронным асяроддзі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## *Тэма 37. Першасныя інфармацыйныя рэсурсы сацыяльна-гуманітарнай сферы*

Характэрныя асаблівасці і структура інфармацыйных рэсурсаў сацыяльна-гуманітарнай сферы. Сувязі інфармацыйных рэсурсаў з асаблівасцямі, інфраструктурай адпаведных галін. Міжгаліновыя інфармацыйныя рэсурсы. Рэгіянальны і персанальны аспекты зместу сацыяльна-гуманітарных інфармацыйных рэсурсаў.

Відавы склад інфармацыйных рэсурсаў: па складзе тэксту, перыядычнасці, па мэтавым прызначэнні, па месцы захавання, форме ўласнасці, прававым рэжыме доступу і іншых прыметах.

Выданні і іх тыпалагічная характарыстыка.

Віды афіцыйных дакументаў. Крыніцы афіцыйнага апублікавання нарматыўна-прававых актаў. Віды нарматыўных бюлетэняў. Віды зборнікаў прававых актаў. Роля цэнтраў прававой інфармацыі ў фарміраванні інфармацыйных рэсурсаў сацыяльна-гуманітарнай сферы.

Арганізацыйнае ўзаемадзеянне цэнтраў фарміравання інфармацыйных рэсурсаў сацыяльна-гуманітарнай сферы ў Рэспубліцы Беларусь.

Асаблівасці прадстаўлення сацыяльна-гуманітарнай інфармацыі ў электронным асяродку. Паўнатэкставыя і мультымедыйныя электронныя рэсурсы сацыяльна-гуманітарнай інфармацыі лакальнага доступу.

Спецыялізаваныя парталы і тэматычныя сайты прававой, эканамічнай і іншай сацыяльна-гуманітарнай інфармацыі.

Персанальныя інтэрнэт-рэсурсы вучоных-гуманітарыяў і іншых дзеячаў сацыяльна-гуманітарнай сферы. Інфармацыйныя рэсурсы сацыяльна-гуманітарнай інфармацыі ў сацыяльных медыя.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## *Тэма 38. Інфармацыйна-бібліяграфічныя рэсурсы сацыяльна-гуманітарнай сферы*

Цэнтры фарміравання бібліяграфічных рэсурсаў сацыяльна-гуманітарнай сферы (Нацыянальная бібліятэка Беларусі, Прэзідэнцкая бібліятэка Рэспублікі Беларусь, Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Я. Коласа НАН Беларусі, іншыя рэспубліканскія навуковыя бібліятэкі, Нацыянальная кніжная палата, Беларускі інстытут сістэмнага аналізу).

Дзейнасць бібліятэк рэгіянальнага і нізавога ўзроўняў, установаў вышэйшай адукацыі і навукова-даследчых інстытутаў, грамадскіх аб'яднанняў як цэнтраў па інфармацыйна-бібліяграфічным забеспячэнні сацыяльна-гуманітарнай сферы.

Класіфікацыя бібліяграфічных дапаможнікаў сацыяльна-гуманітарнай тэматыкі ў адпаведнасці са структурай сацыяльнай сферы і адпаведных навук, з улікам відавога складу дакументаў, іх крыніцазнаўчага значэння, па шырыні зместу і іншых прыметах.

Рэтраспектыўныя бібліяграфічныя выданні Рэспублікі Беларусь па сацыяльных і гуманітарных навуках: галіновыя і тэматычныя дапаможнікі, беларусазнаўчыя бібліяграфічныя дапаможнікі аб развіцці галін сацыяльнай сферы. Паказальнікі асобных відаў сацыяльна-гуманітарных дакументаў. Бібліяграфічныя выданні навуковых прац супрацоўнікаў і выданні асобных установаў сацыяльна-гуманітарнай сферы. Персанальныя бібліяграфічныя дапаможнікі. Крыніцы бягучай бібліяграфічнай інфармацыі аб дакументах сацыяльна-гуманітарнай тэматыкі.

Бібліяграфічныя базы даных па сацыяльных і гуманітарных навуках бібліятэк і інфармацыйных цэнтраў.

### *Тэма 39. Першасныя інфармацыйныя рэсурсы навукова-тэхнічнай і медыцынскай сферы (НТ і МС)*

Характэрныя асаблівасці і структура інфармацыйных рэсурсаў галін НТ і МС. Адлюстраванне іх тэматыкі ў інфармацыйна-пошукавых мовах і тэзаўрусах.

Сувязі інфармацыйных рэсурсаў з асаблівасцямі, інфраструктурай адпаведных галін. Каштоўнасныя ўласцівасці дакументаў навукова-тэхнічнай і медыцынскай сферы. Відавы склад інфармацыйных рэсурсаў: па характары апублікавання, перыядычнасці, тэматыцы. Выданні і іх тыпалагічная характарыстыка. Нарматыўна-тэхнічныя і тэхнічныя дакументы па прыродазнаўстве, тэхніцы, сельскай гаспадарцы, медыцыне.

Характарыстыка дакументнага патоку (ДІП) па прыродазнаўстве, тэхніцы, сельскай гаспадарцы, медыцыне ў Рэспубліцы Беларусь па галіновай прыналежнасці, тэматыцы, храналогіі, тыпавідавых, моўных, аўтарскіх і іншых прыметах.

Паўнатэкставыя электронныя рэсурсы навукова-тэхнічнай і медыцынскай сферы: электронныя даведачныя выданні, базы даных, электронныя часопісы і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 40. Інфармацыйна-бібліяграфічныя рэсурсы навукова-тэхнічнай і медыцынскай сферы*

Склад, структура і класіфікацыя галіновых інфармацыйна-бібліяграфічных рэсурсаў у залежнасці ад галіновай прыналежнасці, відаў уключаных дакументаў, шырыні зместу. Віды паказальнікаў па прыродазнаўстве, тэхніцы, сельскай гаспадарцы, медыцыне па мэтавым прызначэнні: навукова-дапаможныя, прафесійна-вытворчыя, рэкамендацыйныя.

Цэнтры падрыхтоўкі галіновай бібліяграфічнай прадукцыі. Дзейнасць Беларускага інстытута сістэмнага аналізу (БелІСА), Беларускага дзяржаўнага інстытута стандартызацыі і сертыфікацыі (БелДІСС), Нацыянальнага цэнтра інтэлектуальнай уласнасці (НЦІУ) па інфармаванні аб тэхнічных нарматыўна-прававых актах, аб'ектах прамысловай уласнасці, дэпаніраваных навуковых работах, справаздачах аб НДРіВКР.

Роля ЦНБ НАН, РНТБ, РНМБ, БелСГБ у стварэнні бібліяграфічнай прадукцыі і забеспячэнні доступу да сусветных інфармацыйных рэсурсаў. Дзейнасць бібліятэк іншых сістэм па падрыхтоўцы бібліяграфічнай прадукцыі галіновага зместу.

Базы даных уласнай генерацыі па прыродазнаўстве, тэхніцы, сельскай гаспадарцы, медыцыне, створаныя ў бібліятэках, і іх разнавіднасці. Электронныя каталогі галіновых бібліятэк. Зводны электронны каталог і месца ў ім галіновых дакументаў.

Забеспячэнне доступу да замежных інфармацыйных рэсурсаў у галіновых бібліятэках Беларусі. Віды доступу, віды інфармацыйных рэсурсаў.

### *Тэма 41. Першасныя інфармацыйныя рэсурсы мастацка-эстэтычнай сферы*

Дыферэнцыяцыя інфармацыйных рэсурсаў мастацка-эстэтычнай сферы ў залежнасці ад сферы дзейнасці: інфармацыйныя рэсурсы прасторавых, часовых, прасторава-часовых відаў мастацтва.

Характарыстыка першаснага дакументнага патоку інфармацыйных рэсурсаў мастацка-эстэтычнай сферы. Віды дакументаў у сферы прасторавых, часовых, прасторава-часовых мастацтваў.

Перыядычныя выданнні мастацка-эстэтычнай сферы і іх віды.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Выдавецкая структура дакументных патокаў розных галін мастацка-эстэтычнай сферы; роля спецыялізаваных выдавецтваў, навукова-даследчых інстытутаў, устаноў вышэйшай адукацыі, грамадскіх арганізацый і іншых у фарміраванні дакументных патокаў прасторавых, часовых, прасторава-часовых відаў мастацтва.

Дыферэнцыяцыя інфармацыйных рэсурсаў мастацка-эстэтычнай сферы па месцы захавання, форме ўласнасці, рэжыму доступу і іншых прыметах.

Фактаграфічныя, паўнатэкставыя і мультымедыйныя электронныя рэсурсы мастацка-эстэтычнай сферы. Спецыфічныя разнавіднасці інтэрнэт-рэсурсаў прасторавых, часовых, прасторава-часовых відаў мастацтва і асноўныя тэндэнцыі іх развіцця. Спецыялізаваныя парталы і тэматычныя сайты ў галіне мастацка-эстэтычнай сферы. Сайты рэдакцый перыядычных выданняў, выдавецтваў і інтэрнэт-магазінаў. Персанальныя інтэрнэт-рэсурсы прасторавых, часовых, прасторава-часовых відаў мастацтва. Інфармацыйныя рэсурсы мастацка-эстэтычнай сферы ў сацыяльных медыя.

### *Тэма 42. Інфармацыйна-бібліяграфічныя рэсурсы мастацка-эстэтычнай сферы*

Класіфікацыя бібліяграфічных дапаможнікаў мастацка-эстэтычнай сферы з улікам відавога складу дакументаў, іх крыніцазнаўчага значэння, шырыні зместу і іншых прымет.

Рэтраспектыўныя бібліяграфічныя выданні. Галіновыя і тэматычныя бібліяграфічныя дапаможнікі па галінах мастацка-эстэтычнай сферы. Персанальныя бібліяграфічныя выданні.

Крыніцы бягучай бібліяграфічнай інфармацыі аб новых паступленнях дакументаў прасторавых, часовых, прасторава-часовых відаў мастацтва ў фондах бібліятэк і інфармацыйных цэнтраў.

Бібліяграфічныя базы даных бібліятэк і інфармацыйных цэнтраў па прасторавых, часовых, прасторава-часовых відах мастацтва.

Стан і тэндэнцыі развіцця зместавага і відавога складу бібліяграфічных рэсурсаў мастацка-эстэтычнай сферы ў Беларусі і замежных краінах. Інавацыйныя віды сусветных бібліяграфічных рэсурсаў. Роля бібліятэк, навукова-даследчых інстытутаў, музеяў, устаноў адукацыі, тэатраў, кінастудый, творчых саюзаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

у інфармацыйна-бібліяграфічным забеспячэнні мастацка-эстэтычнай сферы.

Спецыялізаваныя цэнтры фарміравання інфармацыйных рэсурсаў краін далёкага замежжа. Міжнародныя бібліяграфічныя праекты, удзел бібліятэк Беларусі ў міжнародным супрацоўніцтве па фарміраванні і выкарыстанні інфармацыйных рэсурсаў мастацка-эстэтычнай сферы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## *Крытэрыі ацэнкі ведаў студэнтаў на дзяржаўным экзамене па вучэбных дысцыплінах «Бібліятэказнаўства» і «Бібліяграфазнаўства»*

**1 бал** – адсутнасць адказу. Студэнт адмаўляецца ад адказу ці адказ цалкам не адпавядае прапанаваным пытанням.

**2 балы** – студэнт не ведае значнай часткі праграмнага матэрыялу, не можа вызначыць бібліятэчныя і бібліяграфічныя з’явы, недакладна ўжывае тэрміны і паняцці бібліятэказнаўства і бібліяграфазнаўства.

**3 балы** – узнаўленне часткі праграмнага матэрыялу па памяці, фрагментарны пераказ і пералічэнне аб’ектаў вывучэння; дапускаюцца грубыя памылкі ў азначэннях бібліятэчных паняццяў, не прыводзяцца прыклады з практычнай дзейнасці бібліятэк.

**4 балы** – недастаткова асэнсаванае ўзнаўленне большай часткі праграмнага вучэбнага матэрыялу па памяці. Уменне прыводзіць прыклады з практыкі работы бібліятэк, але не заўсёды дакладнае валоданне спецыяльнай бібліятэчнай і бібліяграфічнай тэрміналогіяй; па адным з пытанняў недастатковае веданне тэарэтычных палажэнняў.

**5 балаў** – асэнсаванае ўзнаўленне большай часткі праграмнага вучэбнага матэрыялу па памяці.

**6 балаў** – асэнсаванне і ўзнаўленне ўсяго вучэбнага матэрыялу. Апісанне і тлумачэнне аб’ектаў вывучэння, прывядзенне прыкладаў з практыкі, уменне класіфікаваць бібліятэчныя і бібліяграфічныя з’явы і вынікі дзейнасці бібліятэк. Наяўнасць неістотных памылак.

**7 балаў** – поўныя, дакладныя веды і ўзнаўленне праграмнага вучэбнага матэрыялу, раскрыццё сутнасці асноўных паняццяў бібліятэказнаўства і бібліяграфазнаўства, але ў выкарыстанні тэрміналогіі дапускаюцца памылкі.

**8 балаў** – поўныя, дакладныя, грунтоўныя веды і ўзнаўленне праграмнага вучэбнага матэрыялу, раскрыццё сутнасці асноўных паняццяў бібліятэказнаўства і бібліяграфазнаўства. Наяўнасць неістотных фактычных памылак.

**9 балаў** – усебаковае, сістэмнае веданне матэрыялу ў межах праграмы па дысцыплінах «Бібліятэказнаўства» і «Бібліягра-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

фазнаўства». Раскрыццё розных падыходаў да трактоўкі бібліятэчных і бібліяграфічных з'яў, асноўных кірункаў дзейнасці бібліятэк. Дакладнасць азначэння тэрмінаў, паўната адказаў. Паслядоўнасць і лагічнасць выкладання матэрыялу.

**10 балаў** – усебаковае веданне праграмнага матэрыялу і яго вольнае выкладанне, веданне тэарэтычных асноў бібліятэказнаўства і бібліяграфазнаўства. Абгрунтаванне сваёй пазіцыі да трактоўкі той ці іншай бібліятэчна-бібліяграфічнай з'явы. Уменне суадносіць бібліятэказнаўчыя і бібліяграфазнаўчыя веды з напрамкамі практычнай дзейнасці бібліятэк.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЛІТАРАТУРА

## Раздзел І. Бібліятэказнаўства

*Асноўная*

*1.* Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб культуры [Электронны рэсурс] : 20 ліп. 2016 г. № 413-3: прыняты Палатай прадстаўнікоў 24 чэрв. 2016 г.: адобр. Саветам Рэсп. 30 чэрв. 2016 г. // Нац. правовой интернет-портал Респ. Беларусь.

*2. Алешин, Л. И.* Обеспечение автоматизированных библиотечных информационных систем (АБИС) : учеб. пособие / Л. И. Алешин. – М. : Форум, 2015. – 430 с. – (Высшее образование).

*3. Баженов, Р. С.* Поэтапное развитие АБИС: объективная неизбежность и субъективные факторы, сдерживающие процесс автоматизации / С. Р. Баженов, А. И. Павлов // Научные и технические библиотеки. – 2012.– № 11. – С. 67–73.

*4.* Библиотековедение. Общий курс : учебник для бакалавров, обучающихся по направлению подготовки 071900.62 «Библиотечно-информационная деятельность» / С. А. Басов, А. Н. Ванеев, М. Я. Дворкина [и др.] ; науч. ред. А. Н. Ванеев, М. Н. Колесникова. – СПб. : Профессия, 2013. – 240 с.

*5.* Библиотечный фонд: словарь-справочник / Е. И. Ратникова [и др.] ; под науч. ред. Ю. Н. Столярова. – М. : ИНФРА-М, 2017. – 160 с. – (Библиотека малых словарей «ИНФРА-М»).

*6. Бородина, В. А.* Библиотечное обслуживание : учеб.-метод. пособие / В. А. Бородина. – М. : Либерея, 2004. – 166 с. – (Сер. «Библиотекарь и время»).

*7. Галковская, Ю. Н.* Информационный рынок и его правовое обеспечение : учеб.-метод. комплекс / Ю. Н. Галковская ; Белорус. гос. ун-т культуры и искусств. – Минск : БГУКИ, 2017. – С. 88–108, 115–119, 125–130.

*8. Григянец, Р. Б.* Корпоративные системы и технологии автоматизации библиотек в Беларуси / Р. Б. Григянец, Г. О. Лаужель, Е. В. Степанцова // Информатика. – 2013. – № 2. – С. 123–131.

*9. Дзямешка, Л. А.* Абслугоўванне карыстальнікаў бібліятэк: вучэб. дапам. для студэнтаў спецыяльнасці «бібліятэказнаўства і бібліяграфія» / Л. А. Дзямешка, С. А. Паўлава. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2007. – 114 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*10. Зыгмантовіч, С. В.* Кіраванне персаналам бібліятэкі : вучэб. дапам. для студэнтаў выш. навуч. установ па спецыяльнасці 1-23 01 11 Бібліятэказнаўства і бібліяграфія (па напрамках) / С. В. Зыгмантовіч. – Мінск : БДУКМ, 2013. – 148 с.

*11. Ильяева, И. А.* Стратегическое управление библиотекой : учеб.-метод. пособие / И. А. Ильяева, В. Н. Маркова. – М. : КНОРУС, 2008. – С. 25–78.

*12.* Інструкцыя па ўліку і захаванасці бібліятэчных фондаў у Рэспубліцы Беларусь / Нац. б-ка Беларусі [і інш.]. – Мінск, 2002. – 37 с.

*13. Карташов, Н. С.* Общее библиотековедение : учебник : в 2 ч. / Н. С. Карташов, В. В. Скворцов. – М. : Изд-во Моск. гос. ун-та культуры, 1996–1997. – Ч.1 : Теоретические основы библиотековедения / В. В.Скворцов. – 1996. – 88 с.; Ч.2 : Общая теория библиотечного дела / Н. С. Карташов. – М. : Изд-во Моск. гос. ун-та культуры, 1997. – 256 с.

*14. Клімянкова, Н. У.* Сацыялогія і псіхалогія чытання : вучэб.-метад. дапам. / Н. У. Клімянкова. – Мінск : БДУКМ, 2015. – 212 с.

*15. Мелентьева, Ю. П.* Библиотечное обслуживание : учебник / Ю.П. Мелентьева. – М. : ФАИР, 2006. – 252 с. – (Специальный издательский проект для библиотек).

*16.* Менеджмент формирования и учета библиотечных фондов : науч.-метод. пособие / сост.: Н. З. Стародубова, С. В. Митрофанова. – М. : Либерея-Бибинформ, 2011. – 160 с. – (Библиотекарь и время. XXI век ; вып. 130).

*17. Мотульский, Р. С.* Общее библиотековедение : учеб. пособие для вузов / Р. С. Мотульский. – М. : Либерея, 2004. – 224 с.

*18. Петрова, Т. А.* Библиотечный фонд : учеб.-метод. пособие / Т. А. Петрова. – М. : Либерея-Бибинформ, 2007. – 192 с. – (Сер. «Библиотекарь и время. XXI век» ; вып. 58).

*19. Петушко, Н. Е.* Библиотечный маркетинг : учеб.-метод. пособие / Н. Е. Петушко. – Минск : Белорус. гос. ун-т культуры и искусств, 2010. – С. 7–15, 31–46, 57–96.

*20. Ракавецкая, Л. І.* Менеджмент у бібліятэчнай справе (тэхналагічны бібліятэчны менеджмент) : вучэб. дапам. для студэнтаў ВНУ па спецыяльнасці «бібліятэказнаўства і бібліяграфія» / Л. І. Ракавецкая. – Мінск : [б. в.], 2010. – 251, [1] с. : схемы, табл.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*21. Столяров, Ю. Н.* Библиотечный фонд : учебник для вузов по направлению подготовки 071900 «Библиотечно-информационная деятельность» (квалификация «бакалавр») / Ю. Н. Столяров. – СПб. : Профессия, 2015. – 383 с. : ил. – (Сер. «Бакалавр библиотечно-информационной деятельности»).

*22. Суслова, И. М.* Практический маркетинг в библиотеках : учеб.-метод. пособие / И. М. Суслова. – М. : Либерея, 2004. – Вып. 9. – 144 с. – (Сер. «Библиотекарь и время. XXI век»).

*23. Суслова, И. М.* Менеджмент библиотечно-информационной деятельности : учебник для вузов культуры и искусств / И. М. Суслова, В. К. Клюев. – СПб. : Профессия, 2009. – 600 с. : ил., табл. – (Библиотека).

*Дадатковая*

*24.* ГОСТ Р 7.0.93–2015. Библиотечный фонд. Технология формирования = Library colection. Collection development technology. – Введ. 2016–07–01. – М. : Стандартинформ, 2016. – 8 с.

*25.* СТБ 7.20 – 2000. Бібліятэчная статыстыка: Асноўныя палажэнні. – Мінск, 2000. – 11 с.

*26.* СТБ ГОСТ 7.76–2004. Камплектаванне фонду дакументаў. Бібліяграфаванне. Каталагізацыя. Тэрміны і азначэнні = Комплектование фонда документов. Библиографирование. Каталогизация. Термины и определения. – Уведз. 2005–03–01. – Мінск : Дзяржстандарт, 2004. – IV, 47 с.

*27. Морева, О. Н.* Комплектование библиотечного фонда : учеб.-практ. пособие / О. Н. Морева. – СПб. : Профессия, 2012. – 142 с.

*28. Морева, О. Н.* Организация библиотечного фонда : учеб.-практ. пособие / О. Н. Морева. – СПб. : Профессия, 2012. – 127 с.

*29.* Разработать методику оценки эффективности деятельности библиотек по созданию электронных информационных ресурсов: отчет о НИР (закл.) / рук. темы Ю. Н. Галковская ; Белорус. гос. ун-т культуры и искусств. – 2017. – 426 с. – № Гос. рег. 20170558.

*30. Ракавецкая, Л. І.* Этыкет менеджара : вучэб. дапам. для студэнтаў установ выш. адукацыі па спецыяльнасці 1-23 01 11 Бібліятэказнаўства і бібліяграфія (па напрамках), напрамку спецыяльнасці 1-23 01 11-01 Бібліятэказнаўства і бібліяграфія (менеджмент) / Л. І. Ракавецкая. – Мінск : БДУКМ, 2014. – 109 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*31. Яцевич Н. А.* Автоматизация библиотек: проблемы терминологии / Н. А. Яцевич // Науч. и техн. б-ки. − 2007. – № 2.− С. 50−54.

## Раздзел II. Бібліяграфазнаўства

*Асноўная*

*32.* СТБ ГОСТ 7.0–2004. СИБИД. Інфармацыйна-бібліятэчная дзейнасць, бібліяграфія. Тэрміны і азначэнні=Информационно-библиотечная деятельность, библиография. Термины и определения. – Выданне афіцыйнае. – Уведз. 01.03.2005. – Мінск : Дзяржстандарт, 2004. – 35 с.

*33. Блюмин, А. М.* Мировые информационные ресурсы : учеб. пособие для бакалавров / А. М. Блюмин, Н. А. Феоктистов. – 3 изд., перераб. и доп. – М. : Дашков и К, 2015. – С. 90–164.

*34. Захарчук, Т. В.* Информационные ресурсы для библиотек : учеб.-практ. пособие / Т. В. Захарчук. – СПб. : Профессия, 2011. – 126 с.

*35. Зыгмантовіч, С. В.* Арганізацыя і тэхналогія бібліяграфічнай дзейнасці: вучэб. дапам. / С. В. Зыгмантовіч. – Мінск : БДУ культуры і мастацтваў, 2006. – 325 с.

*36. Касап, В. А.* Інфармацыйныя рэсурсы навукова-тэхнічнай і медыцынскай сферы: вучэб.-метад. дапам. для студэнтаў устаноў выш. адукацыі па спецыяльнасці 1-23 01 11 Бібліятэказнаўства і бібліяграфія (па напрамках) / В. А. Касап, Р. А. Ровіна; М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск : БДУКМ, 2014. – 169 с.

*37. Коготков, Д. Я.* Библиографическая деятельность библиотеки: организация, управление, технология : учебник / Д. Я. Коготков. – СПб.: Профессия, 2004. – 304 с.

*38. Колкова, Н. И.* Технологии создания электронных информационных ресурсов: учеб. пособие / Н. И. Колкова, И. Л. Скипор. – М.: Литера, 2013. – С.104–244.

*39. Коршунов, О. П.* Библиографоведение : учебник для студентов, обучающихся по направлению подготовки 071900 «Библиотечно-информационная деятельность» (квалификация «бакалавр») / О. П. Коршунов, Н. К. Леликова, Т. Ф. Лиховид ; под общ. ред. О. П. Коршунова. – СПб. : Профессия, 2014. – 287 с. : ил.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*40. Кузьмініч, Т. В.* Бібліяграфазнаўства. Тэорыя : вучэб. дапам. / Т. В. Кузьмініч. – Мінск : Беларусь, 2012. – 215 с.

*41. Лявончыкаў, В. Е.* Тлумачальны слоўнік бібліятэчных бібліяграфічных тэрмінаў / В. Е. Лявончыкаў, Л. А. Дзямешка, Р. І. Саматыя. – 2-е выд. – Мінск : Выш. шк., 2003. – 230 с.

*42. Ляйко, Н. А.* Каталагізацыя дакументаў. Арганізацыя бібліятэчных каталогаў як інфармацыйна-пошукавых сістэм: вучэб.-метад. дапам. для студэнтаў установ выш. адукацыі па спецыяльнасці 1-23 01 11 «Бібліятэказнаўства і бібліяграфія» / Н. А. Ляйко, А. І. Фядорына. – Мінск : БДУКМ, 2013. – 108 с.

*43. Ляйко, Н. А.* Каталагізацыя дакументаў. Бібліяграфічны запіс. Бібліяграфічнае апісанне : вучэб. дапам. / Н. А. Ляйко, А. І. Фядорына. – 2-е выд., стэрэатып. – Мінск. Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2007. – 180 с.

*44. Ляйко, Н. А.* Каталагізацыя дакументаў. Індэксаванне дакументаў : вучэб. дапам. для студэнтаў спецыяльнасці «бібліятэказнаўства і бібліяграфія» ВНУ / Н. А. Ляйко, А. І. Фядорына. – Мінск, 2011. – С. 10–88.

*45.* Отраслевые информационные ресурсы : учебник / ред.: Р. С. Гиляревский, Т. В. Захарчук [и др.]. – СПб. : Профессия, 2015. – 385 с.

*46. Раманава, Ж. Л.* Інфармацыйныя рэсурсы беларускай мастацкай літаратуры ў прасторы Інтэрнэту / Ж. Л. Раманава // Весн. Беларус. дзярж. ун-та культуры і мастацтваў. – 2010. – № 1 (13). – С. 112–119.

*47. Ровина, Р. А.* Персональные библиографические указатели по естествознанию и технике в Республике Беларусь (2001–2010) / Р. А. Ровина // Навуковы пошук у сферы сучаснай культуры і мастацтва : матэрыялы навук. канф. (Мінск, 28 лістап. 2014 г.) / Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск, 2016. – С. 198–201.

*48. Ровина, Р. А.* Развитие информационно-библиографических ресурсов научно-технической и медицинской сферы в Республике Беларусь (2001–2010) / Р. А. Ровина, В. А. Касап // Навуковы пошук у сферы сучаснай культуры і мастацтва : матэрыялы навук. канф. (Мінск, 28 лістап. 2013 г.) / Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск, 2014. – С. 216–221.

*49. Ровина, Р. А.* Электронные ресурсы отраслевых библиотек Республики Беларусь / Р. А. Ровина // Навуковы пошук у сферы культуры і мастацтва: матэрыялы навук. канф. ПВС,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прысвеч. 40-годдзю заснавання БДУКМ (Мінск, 25 лістап. 2015 г.) / Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск, 2017. – С. 352–357.

*50. Солоневич, А. В.* Компьютерные сети: учеб. пособие / А. В. Солоневич. – Минск: РИПО, 2012. – 158 с.

*Дадатковая*

*51.* ГОСТ 34.601-90. Комплекс стандартов на автоматизированные системы. Автоматизированные системы. Стадии создания. – Введ. 29.12.90; взамен ГОСТ 24.601-86, ГОСТ 24.602-86. – М., 1997.

*52.* ГОСТ 7.1–2003. Библиографическая запись. Библиографическое описание. Общие требования и правила составления = Бібліяграфічны запіс. Бібліяграфічнае апісанне. Агульныя патрабаванні і правілы састаўлення. – Взамен ГОСТ 7.1–84, ГОСТ 7.16–79, ГОСТ 7.18–79, ГОСТ 7.34–81, ГОСТ 7.40–82; введ. 2004-11-01. – Минск, 2004. – 48 с.

*53.* ГОСТ 7.59–2003. Индексирование документов. Общие требования к систематизации и предметизации. – Взамен ГОСТ 7.59–90; введ. 2004-01-01. – М., 2003. – 5 с.

*54.* ГОСТ 7.80–2000. Библиографическая запись. Заголовок. Общие требования и правила составления. – Введ. 2001-11-01. – Минск, 2001. – 8 с.

*55.* ГОСТ 7.82–2001. Библиографическая запись. Библиографическое описание электронных ресурсов. Общие требования и правила составления = Бібліяграфічны запіс. Бібліяграфічнае апісанне электронных рэсурсаў. Агульныя патрабаванні і правілы складання. – Введ.2003-01-01. – Минск, 2002. – 23 с.

*56.* ГОСТ 7.90–2007. Универсальная десятичная классификация: структура, правила ведения и индексирования. – Введ. 2008-07-01. – М. : Стандартинформ, 2008. – 22 с.

*57.* СТБ ГОСТ 7.76-2004. Камплектаванне фонду дакументаў. Бібліяграфаванне. Каталагізацыя. Тэрміны і азначэнні = Комплектование фонда документов. Библиографирование. Каталогизация. Термины и определения. – Уведз. 01.03.2005. – Мінск, 2004. – 47 с.

*58.* Библиотечно-библиографическая классификация: сокращенные таблицы / Рос. гос. б-ка, Рос. нац. б-ка, Б-ка Рос. акад. наук. – М. : Пашков дом, 2015. – 672 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*59.* Библиотечно-библиографическая классификация: средние таблицы. – М. : Либерея, 2001. – Вып. 1–6.

*60.* Библиотечно-библиографическая классификация: таблицы для дет. и шк. б-к. – 5-е изд. – М. : Пашков дом, 2016. – 462 с.

*61. Воройский, Ф. С.* Основы проектирования автоматизированных библиотечно-информационных систем. − Изд. 2-е, доп. и перераб. / Ф. С. Воройский. – М. : Физматлит, 2007. − 521 с. : ил. 25; табл. 19.

*62.* Корпоративная система автоматизации библиотек на основе интернет-технологий БИТ-200u / Объединенный ин-т проблем информатики Нац. акад. наук Беларуси. – Режим доступа: http://uiip.bas-net.by/work/dev_uiip/1968/. – Дата доступа: 13.05.2016.

*63.* Справочник библиографа / О. А. Александрова [и др.] ; науч. ред. Г. Ф. Гордукалова, Г. В. Михеева. – 4-е изд., испр. и доп. – СПб. : Профессия, 2014. – 767 с. : ил., табл.

*64.* Справочник библиотекаря / науч. ред. А. Н. Ванеев, В. А. Минкина. – Изд. 2-е, испр. и доп. – СПб.: Профессия, 2001. – 439 с. – (Сер. «Библиотека»).

*65.* Справочно-поисковый аппарат: учеб. пособие / под ред. И. С. Пилко. – СПб.: Профессия, 2015. – 288 с.

*66. Суминова, Т. Н.* Информационные ресурсы художественной культуры (артосферы) / Т. Н. Суминова. – М. : Акад. проект, 2006. – 480 с.

*67. Шрайберг, Я. Л.* Основные положения и принципы разработки автоматизированных библиотечно-информационных систем и сетей : учеб.-практ. пособие / Я. Л. Шрайберг. – 2-е изд., испр. и доп. – М. : Либерея, 2001.– 102 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**БІБЛІЯТЭКАЗНАЎСТВА І БІБЛІЯГРАФАЗНАЎСТВА**

*Праграма дзяржаўнага экзамену па спецыяльнасці*
*1-23 01 11 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (па напрамках)*

Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар Л. М. Мельнік

Падпісана ў друк 2018. Фармат 60x84 $^{1}/_{16}$.
Папера офісная. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 2,32. Ул.-выд. арк. 2,16. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/177 ад 12.02.2014.
ЛП № 02330/456 ад 23.01.2014.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ